Шыманская А.Ю., студ. гр.311а
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Сівурава Л.П.,
дацэнт

# АКТУАЛІЗАЦЫЯ ЭТНАКУЛЬТУРНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У ДЗЕЙНАСЦІ АМАТАРСКІХ МАСТАЦКІХ КАЛЕКТЫВАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія дзесяцігоддзі ў Беларусі, як і ў іншых постсавецкіх краінах ўзрастае зацікаўленасць сучаснай моладзі нацыянальнымі культурнымі традыцыямі. Павялічваецца колькасць аматарскіх мастацкіх калектываў фальклорнага напрамку. Іх удзельнікі асвойваюць спеўныя, харэаграфічныя, інструментальныя традыцый, займаюцца арганізацыяй і правядзеннем каляндарных, сямейных свят і абрадаў, іншых мерапрыемстваў гістарычна-культурнага зместу. Падчас гэтых мерапрыемстваў актывісты фальклорнага руху маюць магчымасць дакрануцца да этнічных традыцый беларусаў, набываюць веды ў галіне беларускай культуры, развіваюць свае творчыя здольнасці.

Добрым прыкладам працэсу актуалізацыі этнакультурных традыцый беларусаў з’яўляецца дзейнасць фальклорнага гурта “Guda” (Мінск). Калектыў быў створаны ў пачатку 90-х гадоў XX ст. У яго склад увайшлі маладыя вучоныя, студэнты і выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў сталіцы. За час працы калектывам былі дасягнуты значныя поспехі ў вывучэнні, пераймання і папулярызацыі народнага мастацтва, дэманстрацыі і прапагандзе лепшых узораў беларускай культуры і мастацтва за межамі краіны.

Так, за перыяд дзейнасці (1991 – 2010 гг.) фальклорны гурт “Guda” запісаў тры музычныя альбомы — “Архаічныя абрадавыя спевы” (2002, 2007), “Ігры багоў” (2005), “Zara” (2006), узяў удзел у вялікай колькасці міжнародных, рэспубліканскіх і рэгіянальных фестывальных, канцэртных, выставачных мерапрыемствах. З канцэртнымі выступленнямі быў запрошаны ў Вільнюс

(1996, 2004), Калінінград (2003), Гданьск (2004), Вроцлаў (2006), Варшаву (2006–2008), Цьвер (2009), Ашгабад (2010) і іншыя гарады [1, с. 114].

Гледачы высока ацанілі сольныя музычныя праекты — “Ігры багоў” (2005), Русальны канцэрт (2010), а таксама супольныя мастацкія акцыі з калектывамі, якія выконваюць старадаўнюю і сучасную музыку — капэлай Алеся Лася (2003), Зьміцерам Вайцюшкевічам і WZ-Orkiestra (2007), рок-калектывам “Нейра дзюбель” (2002) і інш.

Пра калектыў пішуць: “Этна-фолк гурт Guda сёньня, як і на працягу усяго свайго існаваньня – своеасаблівы арыенцір, як у гусьце, так і ў эмацыйным пляне: рэдка які іншы калектыў праз увесь свой выступ можа правесьці гэткую слоўную вытрымку і глыбока ўзгодненую са сваім унутраным станам сур’ёзнасьць – голаса, твару, постаці”. “Спевы дзяўчат з гурта Guda будзяць этнагенетычную памяць, якая абавязкова жыве ў кожным з нас” [2].

Актуалізацыя мастацкай творчасці патрабуе, у першую чаргу, натуральных (несцэнічных) форм пераемнасці. Увасабляючы гэтую ідэю, спявачкі гурта спрабуюць свае сілы ў якасці сцэнарыстаў, рэжысёраў, арганізатараў і непасрэдных удзельнікаў шматлікіх імпрэз паводле беларускіх народных традыцый, падчас якіх практыкуюцца інтэрактыўныя формы дзейнасці. Гэта каляндарныя святы на адкрытым паветры — Гуканне вясны, Масленіца, Сёмуха, Купалле, Багач, Каляды і інш., сямейныя абрады — Вяселле, Радзіны. Дзякуючы кантактным, імправізацыйным, гульнявым спосабам работы з людзьмі ў дзеянне ўключаецца масавая рознаўзроставая аўдыторыя, якая набывае асабісты камунікацыйны, мастацкі і эмацыянальны этнакультурны вопыт.

Удзельнікі калектыву маюць грунтоўныя веды па культуралогіі, этналогіі, мастацтвазнаўству, вядуць самастойную навукова-даследчыцкую, пошукавую работу, выязджаюць у фальклорныя экспедыцыі, працуюць з бібліяграфічнымі і архіўнымі матэрыяламі. Кантакты з выбітнымі беларускімі этнолагамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этнамузыколагамі, этнахарэографамі, этнакультуролагамі, удзел у навуковых канферэнцыях дапамагаюць ствараць і ўмацоўваць навуковы падмурак творчасці калектыву. Большасць спявачак прайшлі сур’ёзны навуковы шлях — скончылі ВНУ, аспірантуру НАН Беларусі, працуюць над дысертацыйнымі даследаваннямі, маюць навуковыя публікацыі, займаюцца выкладчыцкай дзейнасцю, працягваюць навучанне ў магістратуры і аспірантуры.

Мэтавай аўдыторыяй творчасці фальклорнага гурта “Guda” часцей за ўсё становіцца студэнцкая, вучнёўская і працоўная моладзь, якая знаходзіцца на этапе фарміравання светапоглядных каштоўнасцяў і пэўнага мастацкага густу. Студэнты вышэйшых навучальных устаноў сталіцы, даследчыкі і аматары фальклору з вялікай цікавасцю і прыхільнасць наведваюць лекцыі-канцэрты, творчыя сустрэчы, каляндарна-абрадавыя мерапрыемствы з удзелам калектыву. Дзякуючы шматграннай і плённай творчай дзейнасці фальклорнага гурта “Guda” беларуская традыцыйная спеўная культура набывае прыхільнікаў сярод студэнтаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, студэнцкай моладзі г.Мінска, аматараў буларускага фальклору за мяжой.

Такім чынам, асноўнымі мэтамі дзейнасці калектыву з’яўляецца вывучэнне каляндарна-абрадавай і сямейна-абрадавай спеўнай культуры розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі; узнаўленне беларускай народна-песеннай спадчыны з максімальным захаваннем гукавой фактуры. Значэнне творчасці гурта заключаецца ў вяртанні ў культурную практыку старажытных узораў песеннай культуры беларусаў, расшыфроўцы іх культурнага кантэксту; распрацоўцы спосабаў узнаўлення сямейных і каляндарных урачыстасцей; папулярызацыі беларускіх народных традыцый сярод шырокіх колаў насельніцтва [1, с. 118]. Праекты калектыву адкрываюць сучаснаму слухачу і гледачу глыбінныя пласты беларускай культуры, дэманструюць яе нацыянальны каларыт, годна сцвярджаюць самабытнасць і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасць беларускай культуры і мастацтва ў свеце. Дзейнасць аматарскаіх мастацкіх калектываў фальклорнага напрамку мае вялікае значэнне ў актуалізацыі этнакультурных традыцый, падтрымцы нацыянальнай культуры, далучэнні моладзі да яе лепшых здабыткаў.

Спіс літаратуры:

1. Сівурава Л. Змест і напрамкі творчай дзейнасці фальклорнага гурта "Гуда" //Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 2. Матэрыялы III Рэсп. навук.-практ. канф. (19—20 крас. 2006 г., г.п. Акцябрскі). — Мінск: БелДІПК, 2006. — С. 113-118.

www.guda.fromby.net

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ